# Новы рэктар універсітэта культуры

**7 снежня Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні. Як паведамілі ў прэс-службе Кіраўніка краіны, рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прызначана Аліна Корбут.**



У 1993 годзе яна сама скончыла Інстытут культуры (у будучым універсітэт), затым яго аспірантуру. У 1997 годзе абараніла там дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук. У 2000 годзе скончыла Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы пры Белдзяржуніверсітэце па спецыяльнасці "Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі". З 1998 года працавала ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці як выкладчык, затым старшы выкладчык і дацэнт. З 2011 года выконвала абавязкі намесніка дэкана, а з 2013 года — дэкана факультэта завочнай адукацыі. У 2015 годзе стала першым прарэктарам універсітэта і займала гэтую пасаду да цяперашняга моманту.

---

мастацтваў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, выканаўчы прадзюсар ААТ "Медыяпроф прадакшн" Яўген Арэндарэвіч, кандыдат гістарычных навук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Голубева, прафесар кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Рэната Грыцкова, літаратурны рэдактар часопіса "На экранах" Юлія Ляшко, начальнік аддзела маркетынгу, рэалізацыі і рэкламы Нацыянальнай кінастудыіі "Беларусьфільм" Юрый Ігруша, загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта Людміла Саянкова, рэдактар аддзела кіно часопіса "Мастацтва" Антон Сідарэнка, загадчык аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей Трэцьяк, прадзюсар ААТ "Белпатрыёт" Аляксандр Франскевіч, дацэнт кафедры педагагічнага майстэрства Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Валерыя Хрыптовіч.

**Сцэнарыі прымаюцца да 15 снежня.** Пераможцаў вызначаць у некалькіх намінацыях: "Гісторыя Беларусі", "Нацыянальныя героі", "Жыццё сучаснай Беларусі", "Моладзь Беларусі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ